**Я. І. Місцюкевіч** (Мінск, Беларусь)

# ПЕРАДАЧА ІМПЛІЦЫТНАГА З ДАПАМОГАЙ ПРЫЁМУ ЎМАЎЧАННЯ Ў БЕЛАРУСКАМОЎНАЙ ПУБЛІЦЫСТЫЦЫ

Узмацненне тэндэнцыі да эканоміі моўных форм і сродкаў на сучасным этапе развіцця беларускай мовы знаходзіць сваё адлюстраванне і ў мове газет. Вядома, што тэндэнцыя да эканоміі прыводзіць да структурнай непаўнаты выказвання, што, аднак, не перашкаджае разуменню камуні-катыўнага значэння выказвання. З прынцыпам эканоміі таксама звязана паняцце імпліцытнасці, схаванай часткі лагічных сувязяў паміж прадметамі і з'явамі рэчаіснасці ў семантычным напаўненні сказа, яго граматычнай ці сінтаксічнай структуры. Катэгорыя імпліцытнасці не мае спецыяльных моўных сродкаў выражэння, але часта прыёмы і сродкі экспрэсіўнага сін-таксісу служаць таксама стварэнню імпліцытнай інфармацыі. Асаблівае месца тут належыць фігурам памяншэння аб'ёму выказвання (эліпсіс, умаўчанне), у якіх экспліцытнай інфармацыі надаецца меншае значэнне, а імпліцытная моцна павышае эмацыянальную напружанасць выказвання, скрыта выражае меркаванне і думкі аўтара.

Умаўчанне, ці апасіапеза, як стылістычная фігура, звязаная са з'явай падтэксту, асаблівай мастацкай недасказанасці, калі аўтар свядома недага-ворвае думку, даючы права чытачу здагадацца, часта сустракаецца ў публі-цыстычных артыкулах. Такія даследчыкі, як В. І. Гусеў, А. Ф. Груздзева, разглядаюць умаўчанне як значны кампанент камунікацыі, які разам з маў-леннем складае адзіную базу камунікацыі, Е. П. Сенічкіна лічыць, што апасіяпеза – форма праяўлення падтэксту. Як і Н. Э. Шандроха, мы разгля-даем умаўчанне як сінтаксічны сродак экспрэсіўнага сінтаксісу.

Аўтары публіцыстычных артыкулаў карыстаюцца апасіяпезай, калі не маюць магчымасці растлумачыць прычыны нейкай з'явы, аб якой гаво-рыцца ў першай частцы сказа: *Былі думкі наконт графікі і фатаграфіі, але прыйшлося ў выніку адмовіцца...* («Звязда», 04.02.2017), ці калі аўтар лічыць, што чытач можа сам даць сваё тлумачэнне, і менавіта яно будзе правільным у кожным асобным выпадку: *Па просьбе нашых чытачоў я сустрэлася з лідарам этнагурта «Vuraj» і паразмаўляла пра «касмічных» бабулек, моц саматканай кашулі і песню, якая лечыць...* («Звязда», 04.02.2017).

Часта аўтар апускае інфармацыю, якая, на яго думку, вядома кожнаму чытачу: *Збіраюць грошы ў школе? Яны ж не настаўніку іх збіраюць...* («Звязда», 11.02.2017). Сустракаюцца выпадкі, калі такім чынам аўтар дэманструе сваю няўпэўненасць: *Кажуць, песня лечыць... Ад чаго можна вылечыцца пры яе дапамозе?* («Звязда», 04.02.2017).

Пашырана выкарыстанне апасіяпезы ў выпадках, калі можна працягваць пералік, але гэта не мае сэнсу*: І я шмат разоў бачыла, як іх гадаванцы гэта*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*робяць: на дзіцячай пляцоўцы, на дарожцы, пад дрэвамі...*; *А таму кіраўнікі гарадскіх прадпрыемстваў штодзень і асабіста паведамлялі ў райкам і райвыканкам колькасць сваіх падначаленых, адпраўленых на сельска-гаспадарчы фронт, на чарговую бітву – то за сена, то за збожжа, то за лён...*.(«Звязда», 04.02.2017).

Вялікая колькасць загалоўкаў газет утрымліваюць у сабе апасіяпезу: *У навуку я пайду...* («Звязда», 02.02.2017); *Усе бабры добрыя – чаго пра людзей не скажаш...* («Звязда», 04.02.2017). Такія загалоўкі дазваляюць чытачу паразважаць на тэму таго, пра што будзе артыкул, якую падзею аўтар будзе асвятляць.

Такім чынам, мы бачым, што журналісты газеты «Звязда» ў загалоўках да сваіх артыкулаў шырока выкарыстоўваюць прыём умаўчання, які дапа-магае перадаць імпліцытную інфармацыю чытачу. Аўтары выкарыстоўваюць апасіяпезу ў выпадках, калі не маюць магчымасці выказаць важную ін-фармацыю; калі жадаюць выказаць сваю няўпэўненасць; калі зразумела, што нешта вядома кожнаму і няма сэнсу пісаць, а дастаткова зрабіць намёк; дзеля таго, каб даць магчымасць чытачу паразважаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ